экр 3239

Смерць нямецкім акупантам!

Бібліятэка АН БССР

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН БАРАНАВІЦКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 18 (162) Серада, 5 мая 1943 г.

ПАРТЫЗАНАМ І ПАРТЫЗАНКАМ—НАНОСІЦЬ МАГУТНЫЯ ЎДАРЫ ПА ВАРОЖЫХ ТЫЛАХ, ШЛЯХАХ ЗНОСІН, ВОІНСКІХ СКЛАДАХ, ШТАБАХ І ПРАДПРЫЕМСТВАХ, РАЗБУРАЦЬ ЛІНІІ СУВЯЗІ ПРАЦІЎНІКА.

(Сталін).

## З ЧЭСЦЮ ВЫКАНАЕМ ЗАГАД ВЯЛІКАГА СТАЛІНА!

### БЯЗЛІТАСНА ПОМСЦІЦЬ НЯМЕЦКІМ РАЗБОЙНІКАМ!

1 Мая—дзень агляда баявых сіл працоўных з'явіўся дэманстрацыяй гарачага патрыятызма совецкіх людзей, бязмежнай адданасці народных мсціцелей—партызан сваёй совецкай Радзіме.

Многія партызанскія атрады 1 мая сустрэлі новымі ўдарамі па нямецкіх акупантах. № партызанскі атрад, якім камандуе тав. С-ч, напярэдадні 1 мая пусціў пад адкос варожы эшалон, узарваў мост і т. д.

1 мая ў многіх партызанскіх атрадах адбыліся мітынгі. З вялізарнай увагай партызаны і партызанкі выслухалі загад правадыра народаў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна. Выступаючыя на мітынгах партызаны, камандзіры і палітработнікі выказвалі поўную гатоўнасць аддаць усе сілы на разгром нямецкіх грабіцелей, якія разбурылі нашы гарады і вёскі, залілі беларускую зямлю народнай крывёй.

—У адказ на загад вялікага Сталіна новыя дзесяткі і сотні нямецкіх эшалонаў паляцяць пад адкос, тысячы свежых нямецкіх магіл з'явяцца на нашай зямле,—гаворыцца ў рэзалюцыі, прынятай у № атрадзе.

І няма сумнення, што партызаны—гераічныя мсціцелі за чэсць і незалежнасць Радзімы, за кроў і слёзы совецкіх людзей—з чэсцю выканаюць свае абавязацельствы.

Партызаны і партызанкі! Бязлітасна мсціце нямецкім акупантам! З чэсцю выканаем загад вялікага Сталіна!

### БАЯВЫМІ СПРАВАМІ СУСТРЭЛІ СВЯТА

Вялікае свята—1 Мая наш атрад сустрэў новымі ўдарамі па праклятых нямецкіх акупантах. Напярэдадні свята група партызан нашага атрада пусціла пад адкос яшчэ адзін варожы эшалон, другая група ўзарвала мост на рацэ, а трэцяя знішчыла тэлеграфна-тэлефонную сувязь ворага на працягу 5 км.

З кожным днём наш атрад узрастае. Мясцовае насельніцтва паўстае на барацьбу з нямецкімі разбойнікамі—уліваецца ў рады партызан, каб зброяй знішчаць фашысцкіх ізвергаў.

Камандзір партызанскага атрада Андрэй С.

### Узмацнім удары па варожых камунікацыях

Добрымі баявымі поспехамі сустрэлі 1 мая групы падрыўнікоў, дзе камандзірамі т. т. С. і А. з атрада т. В. Яны выканалі свае прадмайскія абавязацельствы. Тав. С. арганізаваў тры крушэнні варожых воінскіх эшалонаў, а тав. А—два.

Тав. С. пусціў пад адкос цягнік з двайной цягай. Пашкоджана 2 паравозы і 63 вагоны. Забіта каля 50 немцаў. Пры крушэнні другога цягніка з жывой сілай знішчан паравоз, 7 вагонаў і 23 вагоны пашкоджаны. Забіта да 600 гітлераўцаў.

Група тав. А. напярэдадні свята ўзарвала эшалон з жывой сілай. Знішчан паравоз і 47 вагонаў. Колькасць забітых і раненых немцаў яшчэ не ўстаноўдена, але вядома, што пад абломкамі загінула больш 60 фашыстаў.

Групы С. і А., натхнёныя загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза тав. Сталіна, абавязаліся яшчэ больш узмацніць удары па камунікацыях нямецкіх захопнікаў.

Іван К.

### Разграмілі варожы гарнізон

Для ўзмацнення грабяжа навакольных вёсак немцы паставілі свой гарнізон у м. Яромічы. Партызаны №-скага атрада зрабілі налёт на гарнізон. Партызаны з'явіліся ў местэчка якраз тады, калі немцы і іх лакеі—паліцэйскія спраўлялі п'яную оргію. Увесь нямецкі гарнізон разагнан. Забіта некалькі немцаў і паліцэйскіх, 16 гітлераўцаў ранена, спалены 2 аўтамашыны і склад з боепрыпасамі і харчаваннем, знішчан мінамёт і многа пяхотнай зброі.

У суседнім маёнтку немцы забілі польскага пана, а на яго месца хацелі пасадзіць нямецкага абшарніка. Зараз, калі партызаны разагналі нямецкі гарнізон, уцёк і нямецкі абшарнік. Зямлю падзялілі між сабой сяляне.

# На франтах Айчыннай вайны

## (З ПАВЕДАМЛЕННЯ СОВІНФОРМБЮРО АД 5 МАЯ

На Кубані, на паўночны ўсход ад Новарасійска нашы войскі ў рэзультаце жорсткіх баёў прарвалі лінію варожай абароны на фронце 25 км. і занялі чыгуначны вузел Крымская, ператвораны немцамі ва ўмацаваны пункт. Нашы войскі занялі таксама рад населеных пунктаў, у тым ліку Красны, Чарнаморскі, Запарожскі, Благадатны, Вясёлы, Садовы, Мелехаўскі і др. Захоплена 80 гармат, 220 кулямётаў і другія трафеі.

Праціўнік пакінуў на полі бою звыш 7 тысяч забітых салдат і афіцэраў.

4 мая часці нашай авіяцыі на розных участках фронта знішчылі 5 нямецкіх танкаў, да 30 аўтамашын з грузамі і вайскамі праціўніка, 3 склады боепрыпасаў, 7 артылерыйскіх і мінамётных батарэй. Рассеяна і часткай знішчана да батальёна варожай пяхоты.

На Кубані часці № злучэння прадаўжалі весці жорсткія баі. Наша артылерыя, падтрымліваючы дзеянні пяхоты, знішчыла 2 танкі, 27 аўтамашын з грузамі і войскамі, некалькі дзесяткаў дзотаў і бліндажоў праціўніка.

На Заходнім фронце нашы часці вялі разведку. На адным участку група варожых салдат і афіцэраў да 150 чалавек спрабавала весці раведку боем. Нашы войскі сустрэлі іх залповым агнём. Страціўшы звыш 60 салдат і афіцэраў гітлераўцы спынілі свае спробы.

На поўдзень ад Балаклеі агнём нашай артылерыі і мінамётаў разбіта 2 дзоты, 4 бліндажы, знішчана 3 буйнакаліберных кулямёты і да роты пяхоты праціўніка.

На Ленінградскім фронце адбывалася артылерыйская і ружэйна-кулямётная перастрэлка з праціўнікам. У паветраных баях на подступах к Ленінграду савецкія лётчыкі збілі 2 нямецкіх знішчальнікі. Апрача таго агнём зянітчыкаў збіта 4 нямецкіх самалёты.

Партызанскі атрад, які дзейнічае ў Сумскай вобласці, атакаваў нямецкі гарнізон у буйным населеным пункце. Група гітлераўцаў у колькасці 80 чалавек, якая адмовілася здацца ў палон—знішчана. У палон узята 120 салдат і афіцэраў. Захоплена многа вінтовак і боепрыпасаў.

## Налёт нашай авіяцыі на чыгуначныя вузлы, занятыя праціўнікам

2, 3 і 4 мая буйныя злучэнні нашай авіяцыі зрабілі налёт на чыгуначныя вузлы Гомеля, Мінска, Оршы і Бранска. У рэзультаце бамбардыроўкі знішчана многа воінскіх эшалонаў і складаў боепрыпасаў.

У ноч на 5 мая наша авіяцыя далёкага дзеяння зрабіла масіраваныя налёты на чыгуначныя вузлы і ваенныя склады ў гарадах Брэст, Гомель, Бранск. Марская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы парты Ялта і Канстанца і знаходзіўшыяся там караблі праціўніка.

## Бамбардыроўка Дортмунда

У ноч на 5 мая англійская авіяцыя зрабіла буйны налёт на Дартмунд (заходняя Германія). У налёце ўдзельнічала каля 1000 самалётаў, пераважна 4-х маторныя бамбардыроўшчыкі. Былі скінуты 2-х і 4-х тонныя бомбы. Разбуран сталеліцейны завод, а таксама заводы сінтэтычнай нафты і перапрацоўкі вугалю.

## У Паўночнай Афрыцы

Амерыканскія войскі ў Тунісе аўладалі горадам Матэра. Італа-нямецкія войскі, якія знаходзяцца ў Бізерце, амаль поўнасцю ізаліраваны ад астатніх часцей Значная частка войск у гарах акружана. Амерыканцы ўзялі сотні палонных і значныя трафеі. Саюзныя войскі знаходзяцца ў 16 кіламетрах ад Бізерты.

## ЧАРГОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ГІТЛЕРАЎСКІХ ЗЛАДЗЕЯЎ

Нядаўна на Украіне і ў Беларусі з'явіліся лістоўкі, у якіх нібыта савецкія ваенныя ўлады заклікаюць савецкіх партызан... спыніць актыўныя дзеянні супроць нямецкіх акупантаў. Таксама прапануецца партызанскія атрады аб'яднаць у буйныя злучэнні і не выступаць супроць немцаў да асобага загада. А загад гэты трэба чакаць тады, калі будзе ўбран ураджай і рэкі пакрыюцца ільдом...

Партызаны адразу разгадалі, што гэта „заклік“ не савецкіх ваенных улад, а правакацыя гітлераўскіх зладзеяў-фальшываманетчыкаў.

Таварышы партызаны! На правакацыю нямецкіх захопнікаў адкажам магутнымі ўдарамі па варожых тылах!

## ПІСЬМО З НЯМЕЦКАЙ КАТАРГІ

„...Ідзе ўжо сёмы месяц, як я пакутую ў чужой далёкай Германіі. Знаходжуся я ў 25 кілометрах ад гор. Касель. Працую у немца работнікам. Заробак тут няважны, але гэта ўсё роўна, бо за грошы тут нечага купіць.

Адным словам магу сказаць табе, Станіслаў, што Якаў мае адно—работы па самае вушы. І ўперадзе не відаць ніякага прасвета.

На правай грудзі нашу знак „Ост“, што азначае чалавек з усходу, ніжэйшага сорту... Аднак, у параўнанні з другімі я жыву яшчэ добра. Гора таму, хто трапіць на фабрыку. Там церпяць голад і холад, знаходзяцца заўсёды ў заперці і пад канвоем. На будаўніцтве тут працуюць нашы ваеннапалонныя, жыццё іх жудаснае...“

Так піша нявольнік Якаў свайму другу Станіславу ў вёску Р. Баранавіцкай вобласці Не патрэбны каментарыі, каб уявіць сабе, як жывуць нашы людзі ў нямецкай няволі. Мучыцельная смерць чакае таго, хто туды трапіць.

Таварышы! Усімі сіламі пазбягайце вывазу ў фашысцкую Германію!

Рэдкалегія.